*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 27 (372) | Субота, 12 верасня 1959 года | Цана 10 кап.

## З КАМСАМОЛЬСКІМІ ПУЦЁЎКАМІ

Згодна рашэння камітэта камсамола, усе студэнты універсітэта ў час летніх канікул працавалі на будаўніцтве галоўнага вучэбнага корпуса або ў калгасах. Цяпер студэнты здаюць у камітэт камсамола пуцёўкі з адзнакамі аб выкананай рабоце.

Больш 600 нашых таварышоў працавалі будаўнікамі. Добрую славу заваявала брыгада студэнта чацвёртага курса хімфака Меланцава, якой прараб Каралёў вынес пісьмовую падзяку. Не горш працавалі юнакі і дзяўчаты з брыгады студэнта другога курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Міцюры. Усяго больш 26 тысяч гадзін адпрацавалі пасланцы універсітэта на будаўніцтве галоўнага корпуса і інтэрната.

З камсамольскімі пуцёўкамі прыйшлі многія будучыя спецыялісты на калгасныя палі і фермы. Стараннай працай вызначыліся студэнты III курса фізфака. На 45 працадзён на рахунку Уладзіміра Лаўруковіча, які дапамагаў паляводам сельгасарцелі імя Леніна Капыльскага раёна, і студэнта 4-га курса юрфака Фёдара Камозы, што працаваў на Чарнігаўшчыне. 36 працадзён—у Ярашэвіча. Камсамольцы не толькі выдатна працавалі, але і актыўна ўдзельнічалі ў грамадскай рабоце. Так з задавальненнем праслухалі хлебаробы калгаса імя Калініна Пухавіцкага раёна лекцыю аб камуністычнай маралі Эдуарда Шпілеўскага, студэнта фізфака.

**В. СНАПКО.**

## *За моўнымі скарбамі*

Ужо некалькі год інстытут мовазнаўства АН БССР сумесна з кафедрамі мовы нашага універсітэта і педагагічных інстытутаў пры актыўным удзеле студэнтаў-філолагаў вядзе работу па збіранню матэрыялаў аб гаворках Беларусі для складання Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы.

Філалагічнаму факультэту нашага універсітэта і, у прыватнасці, кафедры беларускай мовы і гуртку беларускай дыялекталогіі даручана было сабраць лексічны матэрыял для складання абласнога слоўніка Мінска—Маладзечанскіх гаворак. Доўга і старанна пад кіраўніцтвам доктара філалагічных навук М. А. Жыдовіча і кандыдата філалагічных навук Е. С. Мяцельскай рыхтаваліся на факультэце да прадстаячай дыялекталагічнай экспедыцыі.

Было створана тры экспедыцыйныя групы (кіраўнікі тт. М. Сыракваш, Ул. Лазоўскі і М. Міхей).

На долю групы т. Сыракваша, у якую ўваходзілі студэнты П. Іванчык і А. Мялешка, У. Казак і Н. Палякова, Я. Пілярская і А. Шыкаловіч выпала даследаваць гаворкі Юрацішкаўскага і Ашмянскага раёнаў. Экспедыцыйнай групе т. Лазоўскага ў складзе Л. Рахубы, Л. Мяцельскай, В. Капціловіча, М. Аляшкевіч, М. Чыгрына, П. Абрамовіча, С. Манчукевіч даручана даследаваць гаворкі Смаргонскага і Астравецкага раёнаў.

Групе т. Міхея, у склад якой уваходзілі тт. Жук Г., Галайша Ул. і Акаловіч І.—гаворкі Мядзельшчыны.

Усе тры экспедыцыі сабралі каштоўны матэрыял.

**В. КАПЦІЛОВІЧ,**
**студэнт III курса філфака**

## „УРАЛ" У БДУ

*Днямі з завода вылічальна-аналітычных машын ва універсітэт на матэматычны факультэт паступіла электронна-вылічальная машына «Урал». У бліжэйшыя дні машына будзе ўстаноўлена, і на ёй пачнуць практыкавацца студэнты-вылічальнікі трэціх, чацвёртых і пятых курсаў. Мяркуецца, што універсітэт будзе прымаць заказы на вылічальныя работы ад некаторых прадпрыемстваў і арганізацый горада.*

*Л. УРВІС.*

### ПЕРАД ВУЧОБАЙ

—Добры дзень!—мы скажам
інтэрнату,
Першы крок зрабіўшы на парог.
Зноў на год мы пакідаем хаты
І духмяны скошаны мурог.
Ад расы прастынуць да
світання
Пасынкі старых асенніх рут.
І пяюць дзяўчаты пры
расстанні,
Як праводзяць хлопца ў
інстытут.
Зноў сябры сустрэнуцца ў пакоі
І пра лета гутарку пачнуць,
Як шумяць у Наднямонні хвоі,
Хвалі Нарачанскія як б'юць.
Заплятае сіні верас косы
І рабіны воддалі гараць.
Да сустрэч, палеткі і пракосы,
На вучобу ехаць нам пара.

**М. ПАШКЕВІЧ.**

## *КОРАТКА*

**На працягу многіх год дацэнт Неафіт Ермалаевіч Рагозін цікавіўся прамысловасцю Заходняй Сібіры. Асабліва інтэнсіўна вывучаў ён гэтую галіну на працягу пяці апошніх год. Вынікам шматгадовай працы з'явілася доктарская дысертацыя «Прамысловасць Заходняй Сібіры», якую Неафіт Ермалаевіч нядаўна прадставіў да абароны.**

**На аддзяленні журналістыкі арганізоўваецца новы кабінет тэхнікі друку. Ён будзе аснашчаны паліграфічным абсталяваннем, дыяграмамі і рознымі дапаможнікамі. Студэнты-журналісты змогуць паляпшаць тут свае веды па тэхнічнаму афармленню газет.**

**Згодна новага вучэбнага плана на аддзяленні будзе выходзіць вучэбная газета «Журналіст».**

**Для арганізацыі кабінета і вучэбнай газеты будзе шырока выкарыстан вопыт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава.**

**635 былых работнікаў вытворчасці і нядаўніх школьнікаў прыняты на першы курс стацыянара. На ўсіх факультэтах адбыліся сходы першакурснікаў, выбары камсоргаў, праформаў, назначаны старасты. Навічкам уручаны студэнцкія білеты, праведзены гутаркі адносна правоў і абавязкаў студэнтаў.**

**У Беларусі пачаліся дні латышскай культуры. 15 верасня у актавай зале гуманітарнага корпуса адбудзецца сустрэча студэнтаў універсітэта з латышскімі пісьменнікамі.**

## ТРЭНІРУЮЦЦА ЛЁГКААТЛЕТЫ

У канцы верасня—пачатку лістапада ў Адэсе адбудуцца Усесаюзныя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы спартсменаў таварыства «Буревестник». Каманда нашага універсітэта, заваяваўшы на летнім першынстве ВНУ рэспублікі другое месца, тым самым атрымала пуцёўку на паездку ў Адэсу.

Нашы легкаатлеты ўжо распачалі інтэнсіўныя трэніроўкі. У складзе каманды шэраг выдатных спартсменаў, якія сістэматычна паказваюць высокія вынікі. Гэта бягуння Сахацкая, кідальніца кап'я Верамейчык, бягун на 1.500 і 5.000 метраў Базылеў, першаразраднікі па спартыўнай хадзьбе Котаў і Странкевіч, майстар спорту Гурвіч. Нажаль, наша каманда напэўна паедзе ў Адэсу без майстра спорту Гараева, пераможцы спаборніцтваў па трайному скачку на матчы легкаатлетаў ФРГ—СССР.

Ставіцца пытанне перад прафкомам універсітэта аб правядзенні вучэбна-трэніровачнага збору.

**Я. МАРКАЎ, загадчык кафедры фізкультуры і спорту.**

## Новае ў вучэбных планах

Па новых планах у гэтым навучальным годзе пачнуць займацца студэнты першага і другога курсаў геафака. У вучэбныя планы ўнесены істотныя змены. Кожнаму зразумела, што для географа, які займаецца складаннем карт, патрэбна веданне матэматыкі. Дасканалы аналіз глебы немагчыма правесці, не валодаючы асновамі хіміі. Рух паветраных мас, рэк грунтуецца на законах фізікі. Аднак раней гэтыя дысцыпліны ў нас не вывучаліся. Цяпер матэматыцы, хіміі і фізіцы адводзіцца многа часу. Акрамя таго, уведзена вывучэнне астраноміі.

Для выкладчыка геаграфіі сярэдняй школы вялікае значэнне мае чарчэнне і маляванне. Пытанне ставіцца так, што настаўнік павінен умець не толькі чарціць, але і намаляваць пейзаж. Таму з гэтага года ўведзен новы курс чарчэння і малявання. Безумоўна, усё гэта будзе садзейнічаць усебаковай падрыхтоўцы нашых выпускнікоў.

Новыя элементы вучэбнага плана ўводзяцца і на старшых курсах. Так, сёлета будзе карэнным чынам перабудавана практыка. Раней студэнты па аднаму выязджалі ў раёны ці нават калгасы, дзе займаліся вывучэннем прыроды, гаспадаркі, насельніцтва (у межах раёна). На кожным курсе ў нас 50 студэнтаў. Кіраўнік практыкай у лепшым выпадку мог сустрэцца са сваімі падапечнымі адзін раз у два месяцы. Кантроль за самастойнай работай студэнтаў на месцах таксама не ажыццяўляўся.

Цяпер мы заключаем дагаворы на праходжанне практыкі нашых студэнтаў з Акадэміяй Навук БССР, Міністэрствам сельскай гаспадаркі, Саўнаргасам, абласнымі сельскагаспадарчымі станцыямі, планавымі камісіямі аблвыканкомаў. Па пяць чалавек практыкантаў згодны ўзяць абласныя сельгасстанцыі. Тут студэнты будуць займацца апісаннем фізіка-геаграфічных умоў вядзення сельскай гаспадаркі, складаннем глебавых карт для калгасаў. У кожнай абласной планавай камісіі будуць практыкавацца па два студэнты. Прадугледжана, што яны вывучаць пытанні размяшчэння прамысловасці і сельскай гаспадаркі абласцей і раёнаў рэспублікі. Па некалькі чалавек практыкантаў возьме АН БССР, Міністэрства сельскай гаспадаркі і Саўнаргас.

Па-новаму вырашаецца пытанне з кіраўніцтвам практыкай. Цяпер яно будзе ажыццяўляцца на месцах, а на долю метадыстаў універсітэта застанецца агульны нагляд.

**І. ТРУХАН, дэкан геаграфічнага факультэта.**

## БЛАКІТНЫМІ ДАРОГАМІ

У гэтым годзе мы праходзілі вытворчую практыку па эканоміцы рачнога транспарту Верхне-Дняпроўскага басейна. За час практыкі давялося пабываць у многіх партах і прыстанях Беларусі. Цяжка перадаць усе тыя ўражанні, якія я вынес з практыкі. З борта парахода перада мной праплывалі берагі рэк нашай цудоўнай рэспублікі, залітыя сонцам лугі і лясы, гарадкі і вёскі. А як прыгожы дняпроўскія кручы пад Лоевым, рачныя прасторы Прыпяці—спакойнай і павольнай палескай ракі!

Днём і ноччу па рэках Верхне-Дняпроўскага басейна ідуць пасажырскія і грузавыя судны на Украіну, у брацкую Польшчу. Асабліва цікавым быў параходны маршрут ад Гомеля да Кіева. Пасажыры параходаў гэтага маршрута могуць любавацца Сожам, прыгажуном-Дняпром, велічнай панарамай Кіева, што адкрываецца перад вачыма з борта парахода.

Хутка па рэках басейна пойдуць пасажырскія цеплаходы тыпу «Ракета» на падводных крылах і рачныя пяцімесныя таксі. Адзін з гэтых цеплаходаў дабудоўваецца на стапелях Гомельскай рамонтна-эксплуатацыйнай базы. Напэўна многія з мінчан і не западозрваюць, што прыстань Ждановічы, якая на Мінскім моры, адносіцца да Верхне-Дняпроўскага параходства. Такім чынам, і Мінск стаў своеасаблівым рачным партом. У будучым, кацеры пойдуць і па Свіслачы.

На рэках Беларусі працуюць цудоўныя людзі. Знаёмства з імі, праца поплеч з лепшымі рачнікамі далі мне вельмі многа: і ведаў, і вопыту.

**Я. ЯНОВІЧ,**
**студэнт 4-га курса геафака.**



НА ЗДЫМКУ: Параход на Дняпры.

Фота аўтара.

Я. БАБОСАЎ.

# У ДНІ ФЕСТЫВАЛЬНЫЯ

Сем разоў збіраліся на свае сусветныя сустрэчы пасланцы моладзі ўсіх краін, гасцінна і радасна расчынялі свае плошчы і вуліцы, стадыёны і паркі, свае сэрцы і абдымкі Прага, Будапешт, Берлін, Бухарэст, Варшава, Масква, Вена. Велізарнае значэнне фестывальнага руху заключаецца ў тым, што юнакі і дзяўчаты, белыя і чорныя, камуністы і лібералы, хрысціяне і мусульмане, рабочыя і студэнты аб'яднаны тут не толькі сваей маладосцю, але і сваім нястрымным імкненнем да міру, дружбы і шчасця.



Палатачны гарадок, дзе жылі ўдзельнікі фестывалю.

Зразумела, што ўсё ўзрастаючыя папулярнасць і аўтарытэт фестываляў сярод шырокіх мас моладзі свету не ўсім па душы. Рэакцыйныя сілы імперыялістычных дзяржаў, варожыя справе ўмацавання міру, пускаюць у ход увесь арсенал хлуслівай буржуазнай прапаганды, прымяняюць меры эканамічнага і палітычнага прымусу моладзі, каб перашкодзіць правядзенню фестываляў, падарваць іх аўтарытэт.

Асабліва ярка антыфестывальная дзейнасць рэакцыйных сіл праявілася ў дні падрыхтоўкі і правядзення VII Сусветнага фестывалю ў Вене.

Чаго толькі не рабілі антыфестывальшчыкі, каб сарваць мерапрыемствы Венскага фестывалю! Задоўга да яго адкрыцця прадажная прэса стракацела заметкамі аб непазбежным правале чарговай «камуністычнай прапагандысцкай выдумкі» (так у «свабодным свеце» называюць фестываль.). У дні фестывалю ўсе аўстрыйскія газеты, акрамя органа Кампартыі Аўстрыі «Фольксштымме», наладзілі загавор маўчання і толькі, калі маскоўскі «Спартак» прайграў з мінімальным лікам «Аўстрыі», змясцілі справаздачу аб спартыўных мерапрыемствах гэтага дня. За два дні да адкрыцця фестывалю на вуліцах Вены, як пустазелле, выраслі звыш 100 інфармацыйных будак, якія праследавалі мэту дэзінфарміраваць удзельнікаў фестывалю, імкнуліся навязаць ім антыкамуністычную, антысавецкую літаратуру. У дні фестывалю выходзіла брудная газетка «Венскія навіны» на англійскай, нямецкай, французскай і рускай мовах, старонкі якой былі запоўнены брудным і пошлым паклёпам на Савецкі Саюз, на камуністычныя партыі, на сусветны фестывальны рух. Гэтая газетка прарочыла, што на адкрыццё фестывалю збярэцца не больш 10 тысяч гледачоў, што мастацкія выступленні фестывалю будуць праходзіць у пустых залах. Канцлер Адэнаўэр накіраваў у фонд антыфестывальнага цэнтра 1 мільён заходнегерманскіх марак для антыфестывальнай работы. Амерыканскія, заходнегерманскія і аўстрыйскія гандлёвыя фірмы выдзелілі ў распараджэнне антыфестывальшчыкаў самалёты, якія лятаці над горадам з брудным лозунгам «Фестываль без нас». З Заходняй Германіі, Францыі, Італіі і іншых краін з'ехаліся заядлыя рэакцыянеры, белаэмігранты, здраднікі Радзімы—рускія «федэралісты», украінскія, беларускія, латышскія нацыяналісты, якія старанна імкнуліся апрацаваць у сваім духу пасланцоў адпаведных народаў Савецкага Саюза. На многія фестывальныя мерапрыемствы скупаліся білеты, і народ заставаўся на вуліцы, хоць свабодныя месцы ў залах яшчэ былі. Спецыяльна ў гэтыя дні, каб адцягнуць увагу жыхароў Вены ад фестывальных мерапрыемстваў, былі арганізаваны антыфестывальныя канцэрты, у якіх прымалі ўдзел вядомая «каралева джаза» Эла Фітцжэральд і іншыя арстысты краін Захаду. Сацыялістычныя газеты заклікалі ў дзень адкрыцця фестывалю венцаў выехаць за горад, каб не прымаць удзелу ва ўрачыстасцях адкрыцця. У дні фестывалю у Вене праходзіў так званы «Тыдзень прыгнечаных народаў» (пад якімі меліся на ўвазе народы сацыялістычных краін). Галоўным прамоўцам тут выступала былы міністр здрадніцкага ўрада Імрэ Надзя з байкамі «аб савецкім імперыялізме». Напярэдадні адкрыцця фестывалю каталіцкія арганізацыі Вены арганізавалі антыфестывальныя «шэсці маўчання», аб якіх венцы гаварылі, што іх удзельнікі маўчаць таму, што ім няма чаго сказаць супраць фестывалю.

Вялікія цяжкасці былі з размяшчэннем удзельнікаў фестывалю—для іх не былі прадастаўлены школы, інтэрнаты (за выключэннем інтэрнатаў Венскага універсітэта). Таму большасць удзельнікаў жыла ў палатках на ўскраіне Вены.



Сустрэча з чэшскай моладдзю

Эміграцкія друкарні ў Парыжы і Мюнхене нарыхтавалі велізарнымі тыражамі антысавецкія брашуры, лістоўкі, плакаты і ўсімі спосабамі падсоўвалі і падкідвалі іх удзельнікам фестывалю. З Заходняй Германіі і іншых краін прыбылі цэлыя атрады фашысцкіх малойчыкаў з мэтай зрываць мерапрыемствы фестывалю, апрацоўваць удзельнікаў у антыкамуністычным духу. Кожны з іх атрымліваў штодзённа па 70 шылінгаў кішэнных грошай і па 60 шылінгаў на «іншыя расходы»!



«Кацюшу» спявае савецкая і амерыканская моладзь.

І ўсе гэтыя намаганні, уся дзейнасць антыфестывальных арганізацый, на якую было затрачана грошай больш, чым на самі фестывальныя мерапрыемствы, не далі ніякіх вынікаў, з ганьбай праваліліся, а справа фестывалю, справа міру і дружбы моладзі ўсіх краін атрымала новую цудоўную перамогу.

Аб гэтым сведчыць велізарны поспех першага дня фестывалю. 26 чэрвеня алеі велізарнага венскага парка—Пратэра—напоўніліся людзьмі. Дэлегацыі удзельнікаў фестывалю рухаюцца па суцэльнаму людскому калідору, даўжыня якога звыш двух кіламетраў. Яшчэ цясней становіцца перад уваходам на стадыён. Раз-пораз чуваць галасы: «Ці няма лішняга білеціка?». Уваходзім на стадыён, і нас ахоплівае радаснае пачуццё—уся велізарная чаша стадыёна, які ўмяшчае 70 тысяч гледачоў, запоўнена святочна апранутымі людзьмі.

На берагах Дуная гучаць сардэчныя словы: «фестываль», «дружба», «мір», з якімі так многа звязана добрых надзей у моладзі ўсіх кантынентаў.

За парадкам на стадыёне сочаць не толькі кантралёры—ім сёння дапамагаюць многія рабочыя—камуністы і члены Саюза Свабоднай аўстрыйскай моладзі. Яны рады, што не збыліся спадзяванні праціўнікаў фестывалю, якія імкнуліся зрабіць вакол яго загавор маўчання: Вена прыйшла на стадыён! Вена вітае фестываль! Вена жадае яму поспехаў!

(Працяг будзе.)

# *Знаёмства не адбылося*

Масква. Зеляніна парка Сакольнікі. Сярод гэтай зеляніны—залацісты купал Амерыканскай выстаўкі.

Колькі разоў мы чулі аб амерыканскім вобразе жыцця. Цяпер яго можна ўбачыць—у маіх руках білет на выстаўку.

І вось я ў Сакольніках. Праходжу вароты і амаль бягу да бліжэйшага натоўпу людзей, якія штосьці назіраюць пад пластмасавым дахам. Спыняюся здзіўлены—на памосце белыя цалуюцца з... чорнымі.

—Што гэта?!—вырываецца ў мяне.

—Вяселле!—насмешліва адказвае хтосьці.

—Якое?

—Тыповае, амерыканскае...

У галаве мільгае так нашумеўшы Літл-Рок, раман амерыканскага пісьменніка Джона О. Кіленса «Маладая кроў...».

Штосьці не тое...

Ля аўтамабіляў «Форда», «Крайслера» і іншых кампаній вельмі многа народу. Малады чалавек з мікрафончыкам у руках з натхненнем расказвае аб вартасцях аўтамабіляў. Так, яны добрыя, гэта бачыць кожны.

Малады чалавек—настаўнік. З размовы высвятляецца, што апрача таго ён уладальнік тармазной майстэрні. Тармазная майстэрня і настаўнік! Як далёкія гэтыя два паняцці. Відаць, не вельмі салодкае жыццё аб'яднала іх!

У геадэзічным купале пачынаецца сеанс фільма, у якім, па словах дыктара, можна азнаёміцца з Амерыкай і яе народам.

На сямі экранах пад столлю мільгаюць найпрыгажэйшыя пейзажы, небаскробы, дзіцячыя галоўкі, армады аўтамабіляў, палацы, пракатныя станы, марскія хвалі і ... ногі. Ногі мужчынскія, жаночыя. Сеанс закончан. Было ўсе, але жыцця радавых амерыканцаў мы так і не ўбачылі.

Гавораць, што мастацтва дазваляе пазнаць народ і яго душу. Доўга хаджу сярод каляровага шкла, нейлонавай бялізны і футраў, халадзільнікаў і тэлевізараў, футбольнага інвентару і тэнісных ракетах, кіёскаў пепсі-кола (ён нагадвае грыбны напітак, калі туды замест чаю заліць кофе), каскадаў абутку і, нарэшце, выходжу на адкрытую пляцоўку,—дзе нешта стаіць металічнае.

Што гэта, насмешка?! Дзве жанчыны, вылітыя з бронзы. Адна з іх нагадвае велізарную, празмерна раздутую гумавую дзіцячую цацку. Другая—тое ж самае, толькі ў яе надута адна палавіна цела, а другая абвісшая, як мяшок. Потым якіясьці склёпаныя лісты металу, якія нагадваюць плугі, потым спіральна разрэзаны ліст бляхі і многа такога, што я да мастацтва пабаяўся аднесці наогул. Другая экспазіцыя ў павільёне. Тут выдатныя работы «Белы клоун», «Альберт Эйнштэйн», «Дзіцячы ўрач». Тут жа творы абстрактных мастакоў. Яны толькі выклікаюць здзіўленне і прыкрасць ў наведвальнікаў. У



«Чараўнік». Скульптура, што дэманстравалася на выстаўцы.

іх і назвы нейкія, я сказаў бы, прамысловыя, якія ні аб чым не гавораць: «Камбінаваны бетон № 2» Сцюарта Дэйвіса, «Дзве фігуры і маскі № 3» Аўраама Ратнера, «Канструкцыя з медзі» і «Канструкцыя № 47» Хозэ Дэ Рывера.

Ля аднаго з твораў многа народу. Гіда не відаць, але чуваць, як ён адказвае на пытанні. На палатне—неахайна разлітая фарба з нейкімі кручкамі.

—Што тут адлюстравана?

— Сапраўднасць!

?!

—Так, так, абстрактны мастак асабліва ўспрымае жыццё, перапарвае яго, і яно знаходзіць у яго выйсце вось у гэтых умоўных значках, што тут намаляваны.

Здорава!

Экспазіцыя «Род чалавечы» уразіла мяне. Гэта глыбока пранікнёная фотаэпапея аб чалавеку: каханні, радасці, нараджэнні чалавека, працы, адпачынку—літаральна усіх баках яго жыцця і дзейнасці.

Тут канчаецца «паэзія» аб амерыканскім вобразе жыцця. Тут пачынаецца проза. Вось за сталом сям'я рабочага. У мужчыны зморана твар, напрацаваныя рукі. А вось у рове салдат, які ўткнуўся тварам у зямлю, а ўверсе на фоне неба сімвалічна тырчыць вінтоўка, уваткнутая штыком у зямлю.

Амерыканская выстаўка ў Маскве закрылася. Савецкія людзі праявілі да яе велізарную цікавасць. І гэта зусім заканамерна. Амерыка—краіна, якую нам прадстаіць у гэтай сямігодцы дагнаць. Было зразумела: выстаўка разлічана на тое, каб уразіць гледача. Дык хіба ж не цікава, чым збіраліся здзівіць нас яе наладжвальнікі!

Нажаль, выстаўка нагадвала сабой нейкі велізарнейшы універмаг розных тавараў шырокага ўжытку, трэба прызнаць, вельмі дабротных. Але вось Амерыку індустрыяльную, Амерыку—краіну высока развітай сельскай гаспадаркі, мы не ўбачылі. У гэтым сэнсе знаёмства не адбылося.

**А. ШРУБОК, студэнт II курса аддз. журналістыкі.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 60; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 10774. Зак. 1316. Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.